2022

Верасень

# Бібліятэчны веснік

ДУК " Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк"














**Інфармацыйны веснік**

# Верасень



**1 верасня** супрацоўнікі **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** павіншавалі навучэнцаў 5-га і 9-га класа ДУА ”Сярэдняя школа №1 г. Гарадка ім. І. Х. Баграмяна“ з Днём ведаў і правялі для іх **першы ўрок ”В исторической памяти сила и единство белорусского народа!“.** Падчас урока прысутным нагадалі, што 2022 год аб'яўлены Годам гістарычнай памяці і праходзіць пад знакам захавання гераічнай спадчыны беларускага народа. Навучэнцам 5-га класа прапанавалі прыняць удзел у **патрыятычнай віктарыне ”Славная история Беларуси**“. А навучэнцам 9-га класа прадэманстравалі **прэзентацыю ”Геноцид белорусского народа в годы Великой Отечественной войны и послевоенный период “** і **прэзентавалі кнігу ”Генацыд беларускага народа“.**



**2 верасня да** Года гістарычнай памяці і ў рамках краязнаўчага праекту ”Дарагі сэрцу куток“, які дзейнічае ў **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** была праведзена **міні-экскурсія** ”**Мой родной край**“, **якая** прайшла на тэрыторыі ДУА “Езярышчанская сярэдняя школа ім. П. Э. Анціпава“. Гасцей ”школьнага дворыка“ пазнаемілі з гісторыяй Езярышча, былі прадстаўлены макеты старадаўняй сядзібы, пачтовай станцыі, храмаў гарадокскага раена. Таксама была прадстаўлена бібліятэчна-музейная **выстава ”З гісторыі роднага кута“.** Бібліятэкар пазнаеміла гасцей з макетам замка-крэпасці, літаратурай аб гісторыі пасёлка, а таксама гасцям былі ўручаны **буклеты ”Здесь всему начало“.**







**3 верасня** ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы ў рамках праекта ”Адкрый для сябе беларускую кнігу“ для дзяцей адбылася **літаратурна-пазнавальная гульня ”Сябруй з роднай мовай“**. Гаворка ішла пра беларускую пісьменнасць у старадаўні і цяперашні час.




**4 верасня** работнікі **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** прынялі ўдзел у днях Віцебскай вобласці ў горадзе Пскове з **пляцоўкай ”Гарадоцкі Парнас“**. Мэтай мерапрыемства было развіццё партнёрскіх і сяброўскіх адносін, якія дазваляюць рэалізоўваць сумесныя праекты. З дапамогай інфармацыйнай выставы госці свята даведаліся ад бібліятэкараў пра знакамітага ўраджэнца Гарадоцкай зямлі К. Вераніцына і штогадовым брэндавым фестывалі ў яго гонар. Увагу прысутных прыцягвала выстава самаробных кніг, а паднімала настрой жартоўная бяспройгрышная латарэя.



**4 верасня** да Дня беларускага пісьменства для дзяцей у Сцяпанавіцкай сельскай бібліятэцы была праведзена літаратурная гульня ”Пагуляем у роднае слова“. У ходзе мерапрыемства маленькія чытачы дружна пераводзілі словы з рускай мовы на беларускую, адгадвалі загадкі, складалі перablытаўшыяся прыказкі, называлі беларускіх пісьменнікаў па партрэце. З задорам усе разам удзельнічалі ў фізкультхвілінке.

**8 верасня** адбылося **свята вёскі Пруднікі**, арганізатарам і вядучай якога выступіла бібліятэкар **Прудніцкай сельскай бібліятэкі.** Ганаровым госцем свята стала старшыня Гарадоцкага раённага савета дэпутатаў С. Л. Зуева. Святлана Леанідаўна ад усёй душы павіншавала са святам вяскоўцаў і ўручыла падзякі за шматгадовую і добрасумленную працу і прафесіяналізм фельчару Прудніінскага ФАПА і бібліятэкару Прудніцкай сельскай бібліятэкі. Цёплыя словы гучалі і ад старшыні Вайханскага сельскага савета. Таксама прайшло ўшанаванне старэйшын вёскі і самых маленькіх жыхароў. Шмат добрых слоў гучала ў адрас былых настаўнікаў Прудніцкай сярэдняй школы. Творчы калектыў сектара ”Аўтаклуб“ ДУК ”Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна“ падымаў настрой музычным афармленнем свята. Утульную адмасферу дапамагла стварыць выстава восеньскіх дароў ”**Дары осени**“ з асабістых падворкаў мясцовых жыхароў, а пра цікавую гісторыю края нагадвала краязнаўчая **выстава ”Сцежкамі роднага краю“.**








**9 верасня** ў Межанскай сельскай бібліятэцы для вучняў сярэдніх класаў ДУА ”Межанскі дзіцячы сад-сярэдняя школа імя А.Я. Казлова“ прайшла **літаратурная гадзіна ”Эпопея человеческих страданий“,** прымеркаваная да юбілея беларускага пісьменніка Алеся Адамовіча. Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з жыццёвым і творчым шляхам аўтара, асоба падрабязна спынілася на творах, якія адлюстроўваюць падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Таксама абмеркавалі дзейнасць пісьменніка, як сцэнарыста вядомых мастацкіх фільмаў.

Папулярызацыя здаровага ладу жыцця з’яўляецца адным з асноўных напрамкаў дзейнасці бібліятэк раёна.



**10 верасня ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** для моладзі прайшла **гадзіна інфармацыі ”Мифы и правда о наркотиках“**. Галоўнай мэтай мерапрыемства стала сфарміраваць у маладога пакалення каштоўнаснае стаўленне да свайго здароўя, адмоўную ўстаноўку да курэння, ужывання алкаголю і наркотыкаў. Была дадзена інфармацыя аб уплыве згубных звычак на чалавека. Прысутныя пазнаёміліся з кніжнай выставай ”Вместо сигареты – книга и газеты“.



**16 верасня** бібліятэкар **Даўгапольскай сельскай бібліятэкі** з чытачамі правяла **тэматычную гутарку ”Здоровье в ритме жизни“.** Размова была накіравана на фарміраванне ў прысутных патрэбнасці ў здаровым ладзе жыцця, на ўменне несці адказнасць за сваё здароўе. Да гэтага мерапрыемства была аформлена **выстава ”Сохрани себя для жизни“.**




**10 верасня** на Гарадоччыне ва ўрочышчы Вараб'ёвы горы прайшоў **кулінарны фестываль ”Мара Гурмана - 2022“.** Работнікі **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** прынялі ў ім непасрэдны ўдзел. Была аформлена **бібліятэчная выстава ”Осенний погребок“,** на якой можна было пазнаёміцца з рэцэптамі розных страў з гародніны і садавіны. Дэгустацыя варэння, прадстаўленага на **конкурс ”Забавы сладкоежек“,** распрацаванага і праведзенага работнікамі бібліятэкі, сабрала шмат аматараў салодкага. Па выніках галасавання прыз сімпатый гледачоў атрымала варэнне ”Шоколадная слива“, якое прадставілі госці з горада Невель. Таксама супрацоўнікі бібліятэкі правялі майстар-клас па падрыхтоўцы варэння з рознай садавіны і ягад на вогнішчы, які карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод прысутных на свяце. Вынік перасягнуў усе чаканні. Варэнне атрымалася духмяным і вельмі смачным. Дзеці на свяце каля доміка Бабы Ягі маглі пагуляць у **гульню ”Наш веселый огород приглашает весь народ“** і адказаўшы на пытанні атрымаць смачны прыз.





**11 верасня** бібліятэкар Прудніцкай сельскай бібліятэкі арганізавала для маленькіх карыстальнікаў **майстар-клас па гульні ў вугалкі ”Умееш сам, навучи друга“**. Прысутныя даведаліся аб тым, што на шахматнай дошцы можна гуляць не толькі ў шахматы і шашкі. Ёсць яшчэ шмат гульняў, якія дапамогуць правесці вольны час весела і з карысцю.







**13 верасня** супрацоўнікі **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** падрыхтавалі і правялі для навучэнцаў 4-га класа ДУА ”Сярэдняя школа №1 г. Гарадка ім. І. Х. Баграмяна“ **гістарычны экскурс ”Скарбніца старажытнага пісьменства“.** У ходзе мерапрыемства дзеці даведаліся шмат цікавага пра гісторыю станаўлення і развіцця беларускага пісьменства, кнігадрукавання, пра выдатных беларускіх асветнікаў. Таксама пазнаёміліся з традыцыяй святкавання Дня беларускага пісьменства ў Беларусі, прынялі ўдзел у віктарыне. Напрыканцы бібліятэкар прапанавала дзецям да агляду новыя кніжныя выданні аб знакамітых беларускіх пісьменніках і кнігадрукарах.

**13 верасня,** напярэданні Дня бібліятэк Рэспублікі Беларусь, супрацоўнік Віраўлянскай сельскай бібліятэкі правяла з навучэнцамі ДУА ”Віраўлянская дзіцячы сад-пачатковая школа“ конкурсна-гульнявую праграму ”**Книжное царство – премудрое государство**“. Бібліятэкар расказала прысутным аб тым, што дата свята – 15 верасня выбрана ў гонар заснавання Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Дзеці слухалі вершы пра кнігі, паглядзелі інсцэніроўку верша С. Ільіна ”Две книжки”, удзельнічалі ў конкурсах.



**15 верасня** – Дзень бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Ужо стала добрай традыцыяй для супрацоўнікаў Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі ўшаноўваць найлепшых чытачоў, як дзяцей так і дарослых. На дарослым абанеменце ўсім чытачам было прапанавана пагуляць у **літаратурнае лато ”Беларускія пісьменнікі“,** паўдзельнічаць у **акцыі ”Лаві момант“** у камерцыйным аддзеле, выбраць сабе кнігу ў падарунак на кніжным развале. Бібліятэкары аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры падрыхтавалі для сваіх юных чытачоў цікавыя пазнавальныя мерапрыемствы: былі арганізаваны экскурсіі па бібліятэцы, выстава-гульня ”Кніжкін дрэс-код“, гульня ”Кніжны джэм“, лялечныя спектаклі і віртуальнае падарожжа па самым прыгожым бібліятэкам свету.
















**15верасня** да Дня бібліятэк Рэспублікі Беларусь у **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** быў арганізаваны **літаратурны куфэрак ”Загадочный книжный мир“.** Падчас мерапрыемства бібліятэкары расказалі юным чытачам пра карысць кнігі, крыху пра яе гісторыю і стварэнне бібліятэк. Дзеці расказалі якія іх любімыя кнігі, а таксама прынялі ўдзел у літаратурнай віктарыне, дзе пры выцягванні з куфэрка, траплялася пытанне пра кнігу.






**15 верасня** ў Дзень бібліятэк Рэспублікі Беларусь кожны карыстальнік **Прудніцкай сельскай бібліятэкі** меў магчымасць прыняць удзел ў **дублёр-шоў “Библиотекарь на час”** і ”ператварыцца“ у бібліятэкара. Чытачоў, якія прыйшлі ў бібліятэку ў гэты дзень, абслугоўвалі добраахвотнікі, як дарослыя, так і дзеці. Яны былі рады выступаць у якасці бібліятэкараў, рэкамендаваць літаратуру і дапамагаць ў выбары кніг.

**15 верасня** ўдзельніцы клуба ”Душевный разговор“ сабраліся ў Бычыхінскай **сельскай бібліятэцы** на чарговае пасяджэнне – **творчую гадзіну ”Увлечение и развлечение“.** Прысутныя падзяліліся сваім майстэрствам вязання кручком. Бібліятэкар прапанавала кнігі і часопісы з новымі ўзорамі.



**17 верасня** ў Рэспубліке Беларусь адзначаецца Дзень народнага адзінства. Да гэтай значнай даты ў фае Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы (з **13 верасня**) на працягу тыдня была прадстаўлена **кніжная выстава ”В единстве народа – единство страны“**, а таксама выстаўка плакатаў, якія ўдзельнічалі ў раённым **конкурсе плакатаў ”В единстве наша сила“.**








**16 верасня** ў чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** навучэнцы старэйшых класаў ДУА ”Сярэдняя школа №2 г. Гарадка ім. А.П. Сабалеўскага“ прынялі ўдзел у займальным **інтэлектуальным падарожжы ”Беларусь – страна единства!“**, прымеркаваным да Дня народнага адзінства. Падчас мерапрыемства, удзельнікі выконвалі заданні звязаныя з гісторыяй, культурай і дзяржаўнай сімволікай Рэспублікі Беларусь і разгадалі зашыфраваную ключавую фразу з дапамогай QR-кодаў.



У гэты ж дзень **16 верасня** бібліятэкары **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** сумесна з супрацоўнікамі ДУА ”Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Гарадоцкага раёна“ і ДУК ”Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна“ правялі **літаратурна-музычную сустрэчу ”Единым духом мы сильны“.** Мерапрыемства прайшло ў спецыяльным доме для пражывання ветэранаў, састарэлых і інвалідаў. Для прысутных гучалі цёплыя словы віншавання з Днём народнага адзінства, вершы беларускіх паэтаў і сумесныя песні ваенных гадоў, і меладычныя пра родную Беларусь. Мерапрыемства прайшло ў цёплым, душэўным становішчы і нікога не пакінула абыякавым.



**16 верасня,** напярэдадні святкавання Дня народнага адзінства, супрацоўнік **Межанскай сельскай бібліятэкі** запрасіла вучняў малодшых класаў ДУА ”Межанскі дзіцячы сад-сярэдняя школа імя А.Я. Казлова“ на **гадзіну гісторыі ”Беларусь вчера, сегодня, завтра“.** Бібліятэкар разам з юнымі чытачамі абмеркавалі фотаздымкі, на якіх адлюстраваны значныя падзеі ў гісторыі нашай краіны.




**17 верасня** да Дня народнага адзінства у **Даўгапольскай сельскай бібліятэцы** была арганізавана **кніжная выстава ”Вместе мы – страна Беларусь“.** Кнігі, якія прадстаўлены на выставе, знаёмяць наведвальнікаў з гісторыяй Беларусі, яе асноўнымі сімваламі, славутасцямі, святамі і традыцыямі беларускага народа. Таксама сабрана літаратура, у якой расказваецца аб дасягненнях беларускага народа, аб канкрэтных людзях, якія праславілі нашу краіну. Усе кнігі даюць поўнае ўяўленне аб прыгажосці нашай роднай Беларусі.



**17 верасня** ў **Пальмінскай сельскай бібліятэцы** прайшла **інтэлектуальна-пазнавальная праграма ”Беларусь – страна единства и согласия“**. Гаворка ішла аб важнасці адзінства народа, аб тым што кожны павінен вучыцца дыялогу, паразумленню, дабру і суменай працы на карысць нашай Радзімы. Таксама была аформлена **кніжна-ілюстрацыйная выстава ”Беларусь – это мы“.**



**17 верасня** ў рамках праекта ”Адкрый для сябе беларускую кнігу“ у **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** для вучняў 7-8 класаў ДУА ”Бычыхінская сярэдняя школа ім. І.М. Антонава“ была праведзена **выстава-знаёмства ”Гармонія слова і вобраза паэзіі М.Танка“.** Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з біяграфіяй і творчасцю вядомага пісьменніка.



**20 верасня** супрацоўнікі **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** арганізавалі для выхаванцаў ДУА ”Яслі-сад №2 г. Гарадка“ **свята ”На нашым кірмашы – усе ад душы“.** Бібліятэкары арганізавалі прылавак з рознай садавінай і гароднінай. На багаты кірмаш завіталі дзед Тамаш і баба Еўка з вялізнымі кошыкамі. Чаго толькі не было на тым кірмашы: яблыкі, бульба, морква, бурак. Каб пакупнікам лягчэй было знайсці ўсю патрэбную ім садавіну, яны папрасілі дапамогі ў дзяцей. Тыя з задавальненнем напаўнялі кошыкі дзеда і бабы таварам. А старыя не толькі куплялі тавар, а і весяліліся разам з маленькімі ўдзельнікамі: гулялі ў беларускія гульні, адгадвалі загадкі, спаборнічалі ў конкурсах. Напрыканцы мерапрыемства дзеці частаваліся смачнымі яблыкамі.






У верасні ў ДУА ”Межанскі дзіцячы сад-сярэдняя школа імя А.Я. Казлова“ прайшоў тыдзень беларускай мовы ў рамках якой бібліятэкар **Межанскай сельскай бібліятэцы** правяла для вучняў шэраг мерапрыемстваў. **20 верасня** да 140-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа і Янкі Купалы адбылася **літаратурная гадзіна ”Сыны зямлі беларускай“.** На мерапрыемстве гучалі вершы знакамітых паэтаў.

Гарадоцкая раённая цэнтральная бібліятэка на працягу года прымала ўдзел у абласным праекце па арганізацыі форм работы нестацыянарнага абслугоўвання сельскага насельніцтва ўстаноў культуры клубнага тыпу і бібліятэк **”Бібліяаўтаклубны дэсант“**, прысвечаны Году гістарычнай памяці і Дню народнага адзінства. **21 верасня** адбылося выніковае мерапрыемства на базе ўстаноў культуры Бешанковіцкага раёна з удзелам аўтаклубаў і бібліёбусаў вобласці. У горадзе Бешанковічы бібліятэкар прадстаўляла выставу-прэзентацыю работы па гэтым напрамку. Была ўзнагароджана дыпломам удзельніка і камплектам літаратуры для папаўнення фонду. Затым на канцэрце ў Бачэйкаўскім сельскім Доме культуры Бешанковіцкага раёна арганізаваным аўтаклубам ДУК ”Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна“ супрацоўнік бібліобуса прадставіла **кніжную выставу ”Квітней Беларусь“.**







**21 верасня** ў чытальнай зале **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** прайшло экалагічнае мерапрыемства. На **пазнавальную гадзіну ”Раздельный сбор мусора“** былі запрошаны выхаванцы ДУА ”Яслі-сад №2 г. Гарадка“. Разам з бібліятэкарам дзеці пагаварылі аб тым, з чаго складаецца смецце і адкуль яно бярэцца, што трэба рабіць, каб паменшыць колькасць смецця, як трэба правільна пазбаўляцца ад смецця. Таксама прысутныя з задавальненнем удзельнічалі ў гульнях: ”Птицы“, ”Кто, где живет“, ”Соберем мусор вместе“. Падчас мерапрыемства выхаванцы паглядзелі два мультфільмы аб сартаванні смецця, яго далейшай перапрацоўцы. У канцы пазнавальнай гутаркі ўсе дайшлі да высновы, што нават яны, маленькія дзеці, могуць унесці свой уклад у захаванне прыроды.



**21 верасня** ў **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** для пажылых жыхароў вёскі была падрыхтавана **гадзина інфармацыі ”Личное подворье – хорошее подспорье“.** Бібліятэкар пазнаёміла прысутныхз кнігамі па вядзенню сельскай гаспадаркі.



**23 верасня** ў **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** прайшла чарговая сустрэча для пажылых жыхароў вёскі **гадзіна карысных парад ”Вкусные хлопоты“.** Удзельнікі мерапрыемства даведаліся пра спосабы захоўвання і перапрацоўкі свежых пладоў і гародніны, а таксама падзяліліся сваім асабістым вопытам на дадзеную тэму. Бібліятэкар правяла агляд кніжнай выставы ”Ярмарка рецептов“.

У рамках правядзення Адзінага дня бяспекі ў бібліятэках Гарадоцкай сеткі прайшлі мерапрыемствы, афармляліся інфармацыйныя і кніжныя выставы. На працягу тыдня **з 15 па 23 верасня** карыстальнікі **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** маглі пазнаёміцца з літаратурай, прадстаўленай на кніжнай выставе ”**Мир без опасности**“.




У **аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры** прайшла **акцыя** ”**Переходи дорогу правильно**“, падчас якой раздаваліся інфармацыйныя флаеры.

**23 верасня** ў **аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** ў рамках Адзінага дня бяспекі прайшла **конкурсна-гульнявая праграма ”Путешествие по станциям безопасности“.** Падчас падарожжаў па станцыях, выконваючы заданні, дзеці вучыліся элементарным правілам бяспечных паводзін дома, на вуліцы, у грамадскіх месцах, у тым ліку ў экстрэмальных сітуацыях. Разам успомнілі: як і ў якіх выпадках тэлефанаваць у службу выратавання, як сябе паводзіць у выпадку пажару. Прайшоўшы шматлікія выпрабаванні, разгадаўшы мноства загадак, знайшоўшы выйсце з цяжкіх сітуацый, дзеці прыйшлі да фінішу. А напрыканцы мерапрыемства ўсіх чакаў сюрпрыз – **лялечны спектакль ”Злая спичка“.**






У **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы з 15 па 23 верасня** працавала **выстаўка ”У цэнтры ўвагі дзеці“.** З прадстаўленых інфармацыйных матэрыялаў можна было даведацца як у даступнай форме падрыхтаваць дзяцей да магчымых небяспечных сітуацый.




**16 верасня** бібліятэкар **Сцяпанавіцнай сельскай бібліятэкі** запрасіла маленькіх чытачоў на **гульню-віктарыну ”Твоя безопасность в твоих руках**“. Мерапрыемства праводзілася з мэтай фарміравання ў дзяцей навыкаў асноў бяспекі жыццядзейнасці. У час выканання заданняў прысутныя вучыліся правілам бяспечных паводзін дома, на вуліцы.

**22 верасня** супрацоўнік **Даўгапольскай сельскай бібліятэкі** прыняла ўдзел у **гутарцы за круглым сталом ”Безопасность в каждый дом**“, арганізаваным у Даўгапольскай сельскай радзе. Бібліятэкар прадставіла на мерапрыемстве **літаратурную выставу ”Мы знаем всё про безопасность“.**

**25 верасня** ў рамках мэтавай праграмы ”Возраст жизни не помеха“ у **Верамееўскай сельскай бібліятэцы** сабраліся людзі пенсіённага ўзросту каб разам з бібліятэкарам здзейсніць віртуальнае **падарожжа па святынях Беларусі ”Родины знакомые места“.**

**25 верасня** ў **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** для ўдзельнікаў клуба ”Лесовичок“ адбыўся **экалагічны эрудыцыён ”Свалка по имени Земля“,** прымеркаваны да тыдня Сусветнай акцыі ”Мы чистим мир“. На працягу мерапрыемства дзеці адказвалі на пытанні аб ахове навакольнага асяроддзя, даведаліся якую шкоду прыродзе наносіць чалавек, а таксама прапанавалі свае парады для захавання прыроды і аховы навакольнага асяроддзя. Весела прайшла пазнавальная гульня па сартаванні смецця.

Прыгожая і цудоўная пара – восень. Пра гэта ішла размова ў **Прудніцкай сельскай бібліятэцы 25 верасня.** У восеньскі сонечны дзянёк бібліятэкар разам з маленькімі чытачамі правялі яркую **фотасесію ”Нам дарит осень настроение**“, а затым дзеці з задавальненнем паўдзельнічалі ў конкурсе малюнкаў на асфальце з аднайменнай назвай.





**28 верасня** ў рамках мэтавай праграмы ”Доброта приносит людям радость“ у **Сцяпанавіцкай сельскай бібліятэцы** прайшла **пазнавальна-забаўляльная праграма ”Хозяйка стола – картошка“**. Мерапрыемства пачалося з экскурсіі ў гісторыю бульбы-іншаземкі. Госці даведаліся аб музее бульбы ў Бельгіі і помніку ў Мінске. Прысутныя ўспомнілі прыказкі і прымаўкі пра бульбу, пелі прыпеўкі, гулялі ў гульні ”Кто самый экономный“,”Горячий картофель“.

Першае **пасяджэнне клуба аматараў духоўнай гісторыі Гарадоччыны ”Светач“** адбылося **29 верасня** ў чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі**. Клуб аб'яднаў людзей, якія цікавяцца не толькі краязнаўствам, але і духоўнай гісторыяй нашага краю, што вельмі сімвалічна ў Год гістарычнай памяці. На паседжанні быў разгледжаны склад клуба, яго статут, пазначаны план работы. Сустрэча прайшла ў фармаце дыялогу. Кожны мог прапанаваць ідэі па рабоце клуба. Са сваімі ідэямі па развіцці клуба выступіла начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Святлана Віктараўна Мазжарава. Благачынны Гарадоцкага раёна Уладзімір Дагодзька правёў он-лайн падарожжа па раздзелах сайта Храма Святой Жываначальнай Тройцы. Усім удзельнікам клуба было прапанавана прыняць удзел у напаўненні інфармацыяй сайта Храма. Айцец Уладзімір распавёў аб рабоце па выпуску духоўна-асветніцкага выдання клуба аматараў духоўнай гісторыі Праваслаўя на Гарадокшчыне ”Троицкий вестник“.



